пектах і кіраўніках; б) даць магчымасць студэнтам авалодаць культурай навуковай працы шляхам увядзення адпаведных курсаў.

У сувязі з гэтым мы прапануем тры падыходы прадстаўлення інфармацыі: дысцыплінарна-аспектнай, аспектна-дысцыплінарнай і персаніфікаванай. Нам здаецца, што па меры навучання студэнт зможа больш дакладна рэалізаваць свае здольнасці.

Наступная праблема — пераарыентацыя дыпломаў да патрэб бібліятэчна-бібліяграфічнай практыкі рэспублікі шляхам сумеснага ўдзелу студэнтаў у навуковых праектах бібліятэк, шырокага выкарыстання рэгіянальнага вопыту студэнтамі факультэта завочнага навучання.

Псіхолага-педагагічныя праблемы ўзаемадзеяння студэнтаў і кіраўнікоў узнікаюць перад усімі студэнтамі і асноўнай колькасцю выкладчыкаў. Гэта патрабуе ўдасканалення педагагічнага майстэрства прафесарска-выкладчыцкага складу па наступных аспектах: развіццё і ўдасканаленне псіхолага-педагагічнага мыслення, прафесійнай падрыхтоўкі, развіццё ініцыятывы і творчасці ў сябе і ў студэнтаў, праца над сваімі асобнымі якасцямі.

**Каралькоў М.Н.,**
*дацэнт*

## РАЗВІЦЦЁ ЭСТЭТЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ СТУДЭНТАЎ
### (ПРАБЛЕМЫ, ТЭНДЭНЦЫІ)

Перш чым гаварыць аб развіцці эстэтычнай культуры студэнтаў, неабходна ўдакладніць, па якіх накірунках весці фарміраванне эстэтычнай культуры асобы, удакладніць, што ўваходзіць у паняцце эстэтычнай культуры. Большасць эстэтыкаў выказваюць думку, што эстэтычная культура асобы — гэта адзінства эстэтычных ведаў, перакананняў і нормаў дзейнасці і паводзін. Пры гэтым падкрэсліваецца, што фарміраванне эстэтычнай культуры асобы азначае мэтанакіраванае, паступовае і паслядоўнае набліжэнне да найвышэйшай ступені развіцця ўсёй сістэмы якасцей асобы. Кожны этап яе развіцця характарызуецца пэўнымі асаблівасцямі (узроставымі, сацыяльна-псіхалагічнымі і інш.).

Кампаненты эстэтычнай культуры функцыянальна звязаны. Веды акрэсліваюць кругагляд асобы, перакананні — накірунак эстэтычных ацэнак, поглядаў і густаў, ідэйнай пазіцыі наогул — эмацыянальную накіраванасць жыццядзейнасці, эстэтычныя нормы выступаюць як інструменты рэгуляцыі практыкі. эстэтычныя адносіны задаюць прадметную арыентацыю, сацыяльную канкрэтнасць рэалізацыі эстэтычнай культуры і дзейнасці.

Эстэтычная культура выконвае пэўныя функцыі: інфармацыйна-пазнавальная функцыя звязана з рэалізацыяй ведаў асобы; каштоўнасна-арыентацыйная — з рэалізацыяй эстэтычных перакананняў; дзейнасна-валявая — з рэалізацыяй эстэтычных здольнасцей, якія вызначаюць сацыяльна-творчую накіраванасць эстэтычнай культуры; камунікатыўна-рэгулятыўная функцыя выступае як мадэль эмацыянальнай і нарматыўнай самарэгуляцыі паводзін і дзейнасці асобы.

Эстэтычная культура абумоўлівае змест, форму, аб'ём, прадукцыйнасць эстэтычнай дзейнасці, а эстэтычныя адносіны вызначаюць галоўныя накірункі гэтай дзейнасці, яе выбіральнасць. Гатоўнасць рэалізаваць сістэму эстэтычных адносін у штодзённай дзейнасці-паказчык развіцця эстэтычнай культуры, сведчанне здольнасці чалавека эстэтычна актыўна дзейнічаць.

Аб сфарміраванасці эстэтычнай культуры мы мяркуем на падставе таго, як і ў якой канкрэтнай форме рэалізуецца на практыцы сістэма асабістых эстэтычных адносін, што накіроўваюць чалавека на практычнае прымяненне эстэтычных нормаў і крытэрыяў ацэнкі, якія ў сваю чаргу дапамагаюць адэкватна арганізаваць паводзіны, вызначыць творчае вырашэнне ўзнікаючых праблем і задач.

Эстэтычнае развіццё асобы адбываецца на працягу ўсяго жыцця чалавека. Мы можам, вызначаючы яго тэндэнцыі, умоўна гаварыць

толькі аб вузлавых момантах, вылучаючы на кожным этапе тыя ці іншыя кампаненты эстэтычнай культуры, функцыянальна больш дзейсныя на дадзеным узроўні. Пачатковыя этапы развіцця асобы носяць арыентацыйна-пазнавальны характар. Пазней, у перыяд юнацтва і асабліва сталасці, у выніку якасных зрухаў у структуры дзейнасці асобы пачынаюць пераважаць каштоўнасна-арыентацыйныя і дзейнасна-валявыя матывы. Эстэтычнае развіццё чалавека ёсць узыходжанне да найвышэйшай паўнаты кожнага з кампанентаў і іх сувязей. Сфарміраванне эстэтычных інтарэсаў, густаў, перакананняў з аднаго боку і актуалізацыя эстэтычных адносін, здольнасцей, патрэбнасцей, з другога, вызначаюць у адзінстве змест эстэтычнага развіцця чалавека.

Мэтазгодна разлічаць эстэтычную культуру грамадства і эстэтычную культуру асобы.

У эстэтычную культуру грамадства ўваходзяць, згодна з сучаснымі навуковымі ўяўленнямі, эстэтычныя аб'екты і з'явы, уся разнастайнасць эстэтычных каштоўнасцей, эстэтычныя веды аб іх прыродзе і функцыянiраванні; эстэтычная свядомасць людзей, якая іх адлюстроўвае; эстэтычная дзейнасць і эстэтычныя адносіны людзей; эстэтычна накіраваныя паводзіны і ўзаемадзеянне людзей на падставе эстэтычных каштоўнасцей. Эстэтычнае выхаванне мы разглядаем як спецыяльны канал перадачы эстэтычна-культурных высноў, спосабаў эстэтычнага засваення рэчаіснасці. Гэта выхаванне ўключае таксама фарміраванне эстэтычнай свядомасці і навыкаў эстэтычнага дзеяння.

Эстэтычная культура асобы — неад'емная частка ў свядомым выбары пэўных эстэтычных і мастацкіх каштоўнасцей, у асаблівасцях эстэтычных разважанняў і ацэнак, а таксама ў гатоўнасці творча пераносіць сабраныя эстэтычныя ўражанні, вобразна-выразныя структуры ў сваю прафесіянальную дзейнасць, ва ўзаемадзеянне з іншымі людзьмі, у светаадчуванне і творчыя захапленні, у арганізацыю вольнага часу.

Эстэтычная культура асобы праяўляецца ва ўсіх відах і формах дзейнасці, адлюстроўваючы як агульны ўзровень духоўнай культуры чалавека, так і канкрэтнае выяўленне індывідуальных эстэтычных поглядаў, адносін, эстэтычнага разумення ў дзеяннях, паводзінах, мысленні і мове, арганізацыі жыцця і працы, у міжасабовых зносінах.

Унутраным механізмам эстэтычнай культуры асобы, які вызначае яе паступовую дынаміку, з'яўляецца функцыянiраванне эстэтычнай свядомасці, дыялектыка сувязі патрабаванняў і здольнасцей. Зместавая накіраванасць свядомасці выражаецца ў сістэме эстэтычных адносін да з'яў, рэчаў, разважанняў, пазіцый, дзеянняў і ўчынкаў. Знешне межы эстэтычнай культуры вызначаюцца контурамі сацыяльнай дзейнасці асобы: яе прафесійнай дзейнасцю, творчым самараскрыццём, эстэтычнымі зносінамі ў сферы мастацтва, рэалізацыі каштоўнасных арыентацый.

Такім чынам, эстэтычная культура асобы выяўляецца:

— у развіцці пачуццёва-ацэначнага ўсведамлення яе формаў, якія адлюстроўваюць разуменне цудоўнага і дасканалага, камічнага, трагічнага, брыдкага праз механізм успрымання, перажывання, ацэнкі, густ, ідэалы, погляды;

— у індывідуальнай развітай сістэме эстэтычных адносін, якая дазваляе арыентавацца ў разнастайнасці эстэтычных і мастацкіх каштоўнасцей і выяўляе ўстаноўкі чалавека;

— у навыках інтуітыўнага або свядомага аналізу мастацкай ці эстэтычнай з'явы і гатоўнасці аб'ектыўна і суб'ектыўна матываваць сваю эстэтычную ацэнку;

— у развіцці вобразнага мыслення як творчага працэсу на падставе спалучэнняў і ўзаемных пераносаў эстэтычных і мастацкіх вобразаў, што выступаюць як творчыя аналагі рэальнасці ва ўсіх відах дзейнасці чалавека;

— у эстэтычнай актыўнасці, якая праяўляецца ў адлюстраванні, выбары і творчым выяўленні эстэтычных уражанняў, духоўна-змястоўных эстэтычных зносінах з людзьмі і, галоўнае, рэалізуецца ў розных формах сацыяльнай творчасці.

Неабходна падкрэсліць, што апісаны вышэй механізм выяўлення эстэтычнай куль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

туры з'яўляецца падставай пабудовы структуры мэт і задач студэнтаў, а таксама сістэмы іх эстэтычнага выхаваня.

У практыцы ідэйна-выхаваўчай работы вылучаюцца наступныя складаемыя эстэтычнага выхавання: эстэтычная адукацыя, мэтай якой з'яўляецца фарміраванне тэарэтычных і каштоўнасных асноў эстэтычнай культуры асобы; мастацкае выхаванне (мастацкая адукацыя і мастацкая практыка); фарміраванне мастацкай культуры ў адзінстве навыкаў, ведаў, каштоўнасных арыентацый і густаў асобы; эстэтычная самаадукацыя і самавыхаванне; выхаванне творчых патрабаванняў і здольнасцей; развіццё творчай культуры, эстэтычных адносін да сваёй дзейнасці, творчых матываў, ініцыятывы і ўстановак.

Сацыякультурная сутнасць эстэтычнага выхавання вызначае яго галоўныя метадалагічныя і метадычныя прынцыпы: адзінства ідэйнага зместу і практычнай значнасці; адзінства выхаваня, самавыхаваня, адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі; арганічная ўзаемасувязь з усімі накірункамі ідэйна-выхаваўчай работы, пераемнасць, паслядоўнасць і дыферэнцыраванасць у вырашэнні выхаваўчых задач; сувязь з профілем навучання і спецыяльнасцю; спалучэнне выхаваўчага ўзаемадзеяння з развіццём творчай актыўнасці і самадзейнасці; злучэнне індывідуальных і калектыўных, комплексных і дыферэнцыраваных формаў выхавання.

Эстэтычнаму выхаванню моладзі садзейнічаюць важныя сацыяльныя функцыі, у прыватнасці самаадукацыйныя (або пазнавальныя), звязаныя з развіццём культурнага кругагляду асобы; светапоглядныя, якія вызначаюць накіраванасць ідэйнай пазіцыі: змястоўнасць эстэтычнага ідэала; навуковая і ідэалагічная ацэнкі эстэтычнай інфармацыі, якія ўплываюць на сферу эстэтычных пачуццяў, густ, інтуіцыю асобы і інш.

Акрамя названых галоўных функцый, можна вылучыць і некаторыя спецыфічныя функцыі эстэтычнага выхавання, напрыклад гарманізуючую, геданічную, эўрыстычную і інш.

Якія ж асаблівасці фарміравання эстэтычнай культуры студэнтаў?

Найбольш значнай мэтай эстэтычнага выхавання ў вышэйшай школе з'яўляецца фарміраванне і развіццё ў будучага маладога спецыяліста высокага ўзроўню асабістай эстэтычнай культуры і творчых установак дзейнасці.

Асаблівасці студэнцтва (спецыфіка ўсведамлення, структура дзейнасці, стыль паводзін і жыцця) вызначаюць ступені і формы развіцця яго эстэтычнай культуры. Яны характарызуюцца пэўнай глыбінёй і інтэнсіўнасцю пазнавальных арыентацый, актыўнасцю ў пошуку арыгінальных формаў самавыражэння. У той жа час эстэтычнай культуры студэнтаў уласцівы абстрактнасць і максімалізм ідэйна эстэтычнай пазіцыі; вялікая цікавасць да забаўляльных жанраў сучаснай культуры і інш.

Адлюстраваннем складанасці развіцця эстэтычнай культуры студэнцтва з'яўляецца яе тыпалогія, вызначаемая ўзроўнем, характарам адносін асобы да культурнай дзейнасці, формай праяўлення. Велізарнае значэнне маюць і культурныя традыцыі рэгіёна, профіль ВНУ і факультэта, сацыяльна-псіхалагічныя рысы кантынгенту студэнтаў, наступіўшых ва універсітэт у пэўны год, культурнае асяроддзе ВНУ, курса, акадэмічнай групы.

Ёсць яшчэ адна праблема — розная ступень эстэтычнага развіцця абітурыентаў ВНУ. Яна залежыць ад мноства фактараў: ўзроўню культурнага развіцця сям'і, якасці школьнай адукацыі, уздзеяння асяроддзя.

Аналіз культурнага ўзроўню студэнтаў розных ВНУ паказвае, што часта неаднолькавасць іх развіцця навучальная установа не ліквідуе. Адна з прычын заключаецца ў розніцы структуры інтарэсаў, патрабаванняў і здольнасцей студэнтаў. І яшчэ адна прычына — гэта недахопы ў арганізацыі сістэмы эстэтычнага выхавання.

17-22 гады — вельмі важны этап у эстэтычным развіцці асобы. Малады чалавек авалодаў пэўным запасам ведаў, у яго выявіліся здольнасці і выпрацаваліся некаторыя навыкі творчасці, склаліся каштоўнасныя арыентацыі. Але гэта яшчэ не галоўнае. Галоўнае тое, наколькі гэтыя якасці рэалізуюцца ў структу-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ры яго дзейнасці і паводзін. Іх змест вызначае формы рэалізацыі эстэтычнай культуры. У школьніка змест дзейнасці мае ніжэйшы ўзровень, чым у спецыяліста.

ВНУ ставіць на мэце выпрацаваць устойлівыя творчыя інтарэсы ў студэнтаў.

Працэс сацыялізацыі, выхавання і навучання ў ВНУ і як яго частка эстэтычнае развіццё студэнта прадугледжваюць не аўтаматычнае прыняцце ўсёй масы эстэтычнай інфармацыі ў супярэчнасці і складанасці, а мэтанакіраванае і выбарнае засваенне пэўных каштоўнасцей.

На кожным узроставым этапе ў структуры разумення і паводзін дзейнічаюць свае эстэтычныя крытэрыі. Яны выпрацоўваюцца ў працэсе практычнага асваення свету і ўзаемазвязаны з усімі кампанентамі эстэтычнай культуры асобы. Найбольш высокая ступень сфарміраванасці сістэмы крытэрыяў адлюстроўвае здольнасці асобы граматна, свабодна і поўна меркаваць аб разнастайных эстэтычных з'явах, ацэньваць і класіфікаваць іх , а таксама будаваць сваю творчую дзейнасць у адпаведнасці з сацыяльна значнымі эстэтычнымі нормамі.

Сацыяльнае станаўленне маладога спецыяліста шматгранна, і адна з граней — сцвярджэнне яго творчага патэнцыялу, здольнасцей, якія па-за эстэтычнай культурай цэласна не могуць праявіцца. Адзінства пазнавальнага і творчага пачаткаў у эстэтычнай культуры — вось тая падстава, на якой будуецца эстэтычнае развіццё студэнцкай моладзі.

Ад узроўню сфарміраванасці эстэтычнай культуры студэнта наогул залежыць рэалізацыя патэнцыялу асобы ў будучай спецыяльнай і прафесіянальнай дзейнасці.

Ступень актыўнасці заняткаў студэнтаў у творчых мастацкіх калектывах — канкрэтны паказчык эфектыўнасці арганізацыі эстэтычнага выхаваня.

Спецыяліст без ведання культуры, без засваення яе каштоўнасцей,спецыяліст без шырокага культурнага кругагляду не дасягае прафесійнага майстэрства, бо ў культуры ўсё ўзаемазвязана. Праца, навука, мараль, мастацтва — гэта розныя грані адзінага цэлага.

Праблемы павышэння духоўных запатрабаванняў моладзі, актывізацыя розных формаў выхаваўчай работы, арганізацыя вольнага часу застаюцца вострымі і ўлабадзёнымі. Сёння, на жаль, усё меншае значэнне набываюць асноўныя формы арганізацыі вольнага часу, асабліва ўдзел моладзі ў творчых мастацкіх калектывах.

Кожнае мерапрыемства ў ВНУ павінна быць напоўнена эстэтычным зместам, а маральна-эстэтычная напоўненасць жыцця ва універсітэце падтрымлівае імкненне студэнтаў да развіцця іх эстэтычнай культуры, арыентуе на развіццё творчага патэнцыялу асобы.

Карацееў А.Л.,
*дацэнт*

## ФАРМІРАВАННЕ ТВОРЧАЙ АКТЫЎНАСЦІ ЯК АБАВЯЗКОВАЯ ЎМОВА ЯКАСНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ ВЫКАНАЎЦАЎ У СФЕРЫ ДУХАВОГА МАСТАЦТВА
**/традыцыі і перспектывы/**

І.Творчая актыўнасць навучэнцаў і яе актуальнасць. На першапачатковым этапе навучання ігры на духавых інструментах у дзіцячых музычных школах, спецыялізаваных сярэднеадукацыйных школах з музычным ухілам мы можам весці размову аб абавязковым уключэнні ў навучальны працэс **элементаў творчасці** ў адпаведнасці з ўзроставымі асаблівасцямі навучэнцаў. У сярэдніх жа спецыяльных навучальных установах (музычныя вучылішчы, вучылішчы культуры і мастацтваў) пытанне аб развіцці творчай актыўнасці навучэнцаў павінна разглядацца як **абавязковая ўмова** падрыхтоўкі музыкантаў. У вышэйшых навучальных установах пытанне аб далейшым развіцці творчай актыўнасці музыкантаў становіцца яшчэ больш актуальным і гэта заканамерна, і вырашацца яно павінна з улікам прынцыпу пераемнасці ў навучанні. Аналіз матэрыялаў па арганізацыі навучальнага працэсу ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах, у ВНУ дазваляе гаварыць



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ